## ЖАРТОЎНЫ ВОБРАЗ ДЗЯЎЧЫНЫ, ЯКУЮ НЕ БЯРУЦЬ У ЖОНКІ, РАСПАЎСЮДЖАНЫ Ў ЛЕЛЬЧЫЦКІМ РАЁНЕ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

**А.Л. Дубровец** (УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)
Навуковы кіраўнік – **А.Р. Яшчанка**, канд. гіст. навук, дацэнт

Па сённяшні час у беларусаў незамужнюю жанчыну называюць адзінокай, у той час як нежанатага мужчыну называюць свабодным. Вобраз дзяўчыны, якая не ўступіла ў шлюб, вядомы ў беларускай культуры. Гэта ж тэма застаецца актуальнай і ў сённяшніх жыхароў Гомельшчыны. Цікава выявіць, якія жарты бытуюць у адносінах да такіх дзяўчат і якія з іх паходзяць ад народных вытокаў.

Мэтай праведзенага палявога даследавання ў Лельчыцкім раёне Гомельскай вобласці (2010–2012 гг.) стала характарыстыка жартоўнага вобраза сучаснай дзяўчыны, якую не бяруць ў жонкі. Для дасягнення гэтай мэты было апытана 76 мужчын і жанчын шляхам анкетавання і 10 чалавек з дапамогай апытання. Усе гэтыя рэспандэнты з сельскай мясцовасці, з'яўляюцца карэннымі жыхарамі Лельчыцкага раёна.

Жарты, якія высмейваюць незамужнюю дзяўчыну, featured розныя… 

Пры правядзенні анкетавання на пытанне, ці шмат сёння жартаў гучыць наконт дзяўчыны, якую доўга не бяруць у жонкі, 19% апытаных адказала, што такіх жартаў захавалася шмат, а 48% адказалі, што такія жарты распаўсюджаны, але не ў шырокай ступені, і 31% апытаных такіх жартаў у нашым грамадстве зусім не чулі. Прычым калі аналізаваць дадзеныя анкетавання па ўзросту, то ў інтэрвале ад 50 да 70 гадоў 62% рэспандэнтаў лічаць, што жартаў наконт таго, што не бяруць дзяўчыну ў жонкі, у нашым грамадстве шмат, іншыя ўзроставыя групы паказваюць меншыя працэнтныя паказчыкі. Увогуле апытанныя ва ўзросце ад 10 да 50 гадоў такія жарты чулі нячаста. Адказ Лізаветы Сідараўны Зайчык 1944 года нараджэння на гэтае пытаннне пад час інтэрв'ю такі: «Канешне, такіх жартаў шмат, бо ўсе адзін у аднаго за спіной перашэптваюцца і смяюцца, чаму яе не бяруць у жонкі, што з ёй не так?».

З гэтага вынікае, што жарты, якія высмейваюць дзяўчыну ў традыцыйным беларускім грамадстве, несумненна, былі вельмі шырока распаўсюджаны. А вынікі даследавання, праведзенага ў Лельчыцкім раёне, паказваюць, што такі жартоўны вобраз дзяўчыны сёння ёсць, але не паўсюдна вядомы, ён пастунова знікае пад уплывам сучаснай урбанізаванай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины